Педагагічны бюлетэнь грамадскага аб'яднання "Беларуская ліга бацькоў і педагогаў "Крок за крокам"



**В. У. Кійко,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі СШ № 145 г. Мінска

# “Якія вочы мне дало каханне! Але...спярша душу яму аддаў...”

## Псіхалогія кахання ў рамане І.Мележа “Людзі на балоце”

Разважанні напярэдадні ўрока

Заўсёды, калі мы з вучнямі падыходзім да ўрокаў, на якіх трэба аналізаваць твор, мне хочацца насыціць іх нейкай дадатковай інфармацыяй і падаць матэрыял нестандартна. У гэтым мне дапамагаюць метады развіцця крытычнага мыслення.

Урок у 11 класе, які я прапаную чытачам часопіса, не стаў выключэннем.

*Тэма кахання – гэта адна з тэм маральнага плана*, якая патрабуе асаблівай асцярожнасці: важна не ператварыць яе ў павучанні, не знізіць той эмацыянальны настрой, тую радасць, тое задавальненне, якія вучні атрымалі ад прачытанага. Маёй галоўнай задачай на ўроку было спрыяць развіццю асабістага вопыту ўзаемаадносін праз аналіз літаратурнага тэксту. Для яе дасягнення я выкарыстала *тэхналогію развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо.*

Мэты:

- ініцыіраваць актыўны і прадуктыўны аналіз мастацкага твора, садзейнічаць асэнсаванню ўзаемаадносін галоўных герояў рамана Івана Мележа “Людзі на балоце”; прааналізаваць паняцце “каханне” ў дачыненні да паводзін кожнага з герояў (Ганна, Васіль, Яўхім, Хадоська);
- развіваць і ўдасканальваць уменне працаваць з мастацкім тэкстам, выдзяляць у ім асноўныя тэзісы, падбіраць цытаты для характарыстыкі паводзін герояў, развіваць крытычнае і лагічнае мысленне, маўленчыя навыкі вучняў; спрыяць развіццю асабістага вопыту ўзаемаадносін праз аналіз тэксту;
- выхоўваць у вучняў культуру інтымных пачуццяў.

**Час, адведзены на вывучэнне тэмы:** 45 хвілін.

**Ход урока**

***Матывацыя***

Вучні падзелены на тры групы. Кожная група мае ліст “Ацэнка работы ў групе”.

| Прозвішча, імя вучня | Самаацэнка (адзнака) | Адзнака назіральніка | Адзнака настаўніка |
|---|---|---|---|
| | | | |

Перад вучнямі ляжаць лісткі з незакончанай фразай: “Я прыйшла (прыйшоў) на ўрок, каб...” Вучні дапісваюць фразу, а затым зачытваюць яе.

Я таксама заканчваю гэту фразу: “Я прыйшла на ўрок, каб разам з вамі звярнуцца да адной з вечных тэм у літаратуры – тэмы кахання.” Гэта – мой выклік вучням, маё паведамленне аб тым, што адбудзецца на нашым уроку. Ад таго, як я “кінула” яго напачатку ўрока, залежыць настрой і вучняў, і настаўніка.

***Стадыя выкліку***

Зачытваю эпіграф – цудоўны верш Р.Баравіковай.

*Казаў мудрэц: яно – і нараканне,*
*І сонца, і пякучай цемры сплаў...*

*"Якія вочы мне дало каханне!"*
*Але... спярша душу яму аддаў.*
*Гляджу на ўсё вачамі маладымі*
*І гнеўнымі, і добрымі ўдвая...*
*Каханне і прынізіць, і ... узніме,*
*Пакуль у ім жыве душа мая.*

Прашу вучняў, каб яны вызначылі тыя два радкі, якія маглі б стаць тэмай урока, і аргументавалі свой выбар. (Вучні атрымалі дамашняе заданне, з якога яны зразумелі пра якіх герояў і іх узаемаадносіны пойдзе гаворка на ўроку.)

Адказы вучняў былі наступныя: адна з груп прапанавала апошнія два радкі, а дзве другія (большасць вучняў) выбралі радкі, якія і сталі тэмай нашага ўрока: ***"Якія вочы мне дало каханне!" Але... спярша душу яму аддаў"...***

Пасля таго як тэма запісана на дошцы, ідзе абмеркаванне дамашняга задання: вучні адказваюць на тыя пытанні, што былі імі падрыхтаваны дома:

Як Мележ перадае нараджэнне кахання паміж Ганнай і Васілём?

Якім было каханне маладых людзей?

Як каханне паўплывала на Ганну і Васіля?

Мне прыемна, што вучні добра падрыхтаваліся: яны зачытваюць цытаты з тэксту, шчыра і сур'ёзна іх каменціруюць.

Далей вучні вызначаюць, якія пытанні яны б хацелі больш дэталёва абмеркаваць. Пастаноўка задач урока вучнямі.

***Стадыя асэнсавання***

Выкарыстоўваю графапраектар. На слайдзе вучні бачаць шэсць азначэнняў кахання:

- "эрас" – *страснае, імкнецца да поўнага фізічнага ўладання;*
- "людус" – *каханне-гульня, якой не ўласціва глыбіня пачуцця і дастаткова лёгка дапускаецца магчымасць здрады;*
- "сторге" – *цёплае і трывалае каханне-сяброўства*;
- "прагма" – *сумяшчае людус і сторге, каханне па разліку;*
- "манія" – *каханне-залежнасць ад аб'екта свайго пачуцця;*
- "агапе" – *бескарыснае каханне, страснае і цёплае.*

Трэба суаднесці гэтыя псіхалагічныя азначэнні з наступнымі парамі герояў твора:

першая група: Васіль – Ганна;

другая група: Ганна – Яўхім;

трэцяя група: Яўхім – Хадоська.

Наступнае заданне: словы "душа", "розум", "цела" размеркаваць па меры важнасці для кожнага з герояў, абгрунтаваць сваю думку.

Тут думкі вучняў разышліся. Возьмем, напрыклад, Ганну: адны па першае месца ставілі "душу" і гаварылі, што яна жыве толькі пачуццямі, іншыя гаварылі – "розум", бо выйшла замуж па разліку. У гэтым заданні вучні глыбока раскрылі праблему, і было відаць, што працавалі з цікавасцю.

Падводжу вучняў да **вываду**: Гледзячы на гэтыя ўмоўныя схемы, мы бачым, што ўсе героі рамана разумеюць паняцце "каханне" па-свойму. Мележ-псіхолаг заўважыў і паказаў чытачу ўзгодненасць, адзінства і гармонію ўнутранага свету чалавека з яго паводзінамі і ўчынкамі, або наадварот – супярэчлівасць, разлад, неадпаведнасць думак, імкненняў чалавека з тым, што ён пад уплывам абставін вымушаны рабіць.

Працягваем разважанні пра псіхалогію (а магчыма, і філасофію) кахання ў рамане І.Мележа "Людзі на балоце". Вучні павінны пералічыць праблемы, якія вымусілі Ганну выйсці замуж за Яўхіма:

- сацыяльныя прычыны (беднасць сям'і Чарнушкаў);
- угаворы мачыхі;
- крыўда на Васіля;
- традыцыйнае меркаванне "сцерпіцца-злюбіцца";
- уплыў Карчоў.

Імкнуся, каб мае вучні глядзелі на праблему крытычна, заўважалі дэталі, непрыкметныя на першы погляд, якія "схаваліся" ў тэксце твора.

**Дыскусія**. "Ці правільны выбар зрабіла Ганна?" Выкарыстоўваю ***метад "Вуглы"*** – у групе не абмяркоўваем, кожны сам павінен вырашыць гэта для сябе. Пасля тыя, хто лічыць "так", ідуць у адзін бок, тыя, хто лічыць "не",— у другі бок. У новай групе за 2 хвіліны вучні думаюць над аргументамі свайго выбару.

Ход дыскусіі

- Адна група – аргумент, другая – адказ; калі ў ходзе дыскусіі нехта змяняе свой погляд на праблему, ён пераходзіць у другую групу.
- Пасля дыскусіі раздаю лісткі кожнаму: на лістках з аднаго боку напісаць адказ на пытанне: як бы вы паступілі на месцы Ганны? А з другога боку — сваё меркаванне аб тым, што яна адчувае?
- Некалькі чалавек зачытваюць свае адказы (выкарыстоўваю прыём "*Апошняе слова за мной*", які дапамагае мне весці своеасаблівы маніторынг таго, як хто зразумеў тэму).

Звяртаючыся да адной з груп, абагульняю: "Вы пераканалі нас у тым, што каханне мае над чалавекам вялікую ўладу, яно не падпарадкоўваецца нашаму розуму і жаданням. Можа натхніць, узвысіць, а можа стаць пакутай. Вернемся да задач нашага ўрока: адзначце, наколькі вы выканалі пастаўленыя перад сабой задачы".

***Стадыя рэфлексіі***

Перад вучнямі — выразаныя з каляровай паперы дэталі, з якіх можна пабудаваць дом: падмурак, сцены, дах. Звяртаюся да дзяцей з незвычайнай прапановай: "Пабудуйце свой дом "кахання". Упішыце ў гэтыя часткі дома, з чаго, на вашу думку, павінна складацца каханне. Наклейце іх на дошку пры дапамозе скотча".

Прапаную звярнуцца да лістка, з якога мы пачалі ўрок. Прашу закончыць фразу: "Я іду з урока...". Вось адно з разважанняў: "Я іду з ўрока з большым разуменнем паняцця "каханне"; з веданнем яго азначэнняў, і гэтыя веды мне вельмі спатрэбяцца ў жыцці. Калі раней мне здавалася, што выбіраць мужа я буду толькі сэрцам, то зараз мне здаецца, што і душой, і розумам".

**Разважанні пасля ўрока**

Гэта быў першы ўрок па абмеркаванню і аналізу

рамана Івана Мележа “Людзі на балоце”. Чаму менавіта гэту тэму, тэму кахання, я ўзяла на першым уроку? Напэўна таму, што пасля прачытання рамана яна больш за ўсе астатнія хвалявала маіх вучняў, яшчэ не дарослых, але ўжо і не дзяцей. Больш таго, дзякуючы гэтай тэме, вучні захацелі прачытаць наступныя раманы Мележа — “Подых навальніцы”, “Завеі, снежань”. Старшакласнікі хочуць даведацца: што будзе з *Васілём і Ганнай, ці будуць яны калі-небудзь разам*?

Я зразумела, што і на наступным уроку мы працягнем абмяркоўваць тэму кахання. Чаму? *Па-першае*, вучняў вельмі зацікавілі шэсць азначэнняў паняцця “каханне”. *Па-другое*, па-рознаму яны размеркавалі словы “душа”, “розум”, “цела”, і кожны адстойваў сваю думку, а гэта самае галоўнае для развіцця крытычнага мыслення ў вучняў. *Па-трэцяе*, гэта асаблівасць дыскусіі: толькі яе можна было вынесці на асобны ўрок – і не хапіла часу, бо аргументы, якія “сыпаліся” з двух бакоў, былі цікавымі і разнастайнымі, а самае галоўнае, што ні адзін з вучняў не застаўся абыякавым да гэтага пытання.

Мне здаецца, што ўрок атрымаўся інфармацыйна насычаным і жывым: вучні свабодна выказвалі свае пачуцці, фармулявалі незалежныя вывады, з павагай адносіліся да думкі іншых. Я цвёрда ўпэўнена: дзякуючы метадам развіцця крытычнага мыслення, мы не толькі вучым, але і выхоўваем асобу.